«Культура», «БСТ», «1+1»;
новости спорта;
криминальная хроника;
кроссворд.

## Оставайтесь с нами!

## Подпишись и выиграй!

ПОДПИШИСЬ НА «ПІНСКІ ВЕСНІК» НА ПОЛУГОДИЕ И СТАНЬ УЧАСТНИКОМ ЛОТЕРЕИ!

Холодильник и десятки других ценных и нужных вещей ждут своих хозяев!

Оформить подписку можно, как и раньше, на почте.

А ТЕПЕРЬ ЕЩЕ И В ОТДЕЛЕНИЯХ.СБЕРБАНКА.

Долгие вам лета и всяческие блага!

и мониторингу окружающей среды.

Выдаецца з кастрычніка 1990 года

# Пінскі веснік

Грамадска-палітычная газета

№ 46-47 (1207-1208)

31 мая 2002 года. Пятніца. Тыраж 7008. Цана 200 руб.

# Кругі жыцця, асвечаныя сэрцам



Гэтая праца магла б убачыць свет яшчэ пяць год таму назад. Але ж пры адной умове — калі б знайшліся грошы. Іх не было на выданне ні ў Нацыянальнай Акадэміі навук, дзе працуе Валянціна Іванаўна Локун, ні ў яе самой. Бо размова ішла аб 800 далярах ЗША. Менавіта столькі каштавала навукова-папулярнае выданне нашай знакамітай зямлячкі «Кругі жыцця — кругі літаратуры», якое толькі што выйшла з друку. У ім даследуецца творчасць вядомых беларускіх мастакоў слова Алеся Асіпенкі, Уладзіміра Дамашэвіча, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Валянціны Коўтун, Віктара Карамазава, Алеся Жука і іншых. Адрасавана кніга студэнтам, настаўнікам і ўсім тым, хто цікавіцца беларускай літаратурай.

Гэта трэцяя кніга В.І.Локун. Раней убачылі свет зборнік «Да новых вышынь» і манаграфія «Маральна-філасофскія пошукі беларускай ваеннай і гістарычнай прозы. 50-60-я гады». Акрамя таго, Валянціна Іванаўна з'яўляецца аўтарам шэрагу раздзелаў чатырохтомнай «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя». Дарэчы, удзел у яе напісанні лічыцца досыць сур'ёзным здабыткам у творчай біяграфіі літаратара.

Новая кніга В.І.Локун мае мастацкую і навуковую каштоўнасць. І яе выхад успрымаецца як значная падзея ў беларускай літаратуры, не кажучы пра саму аўтарку — старшага навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Я.Купалы Нацыянальнай Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, кандыдата філалагічных навук, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі. Для Валянціны Іванаўны гэта сапраўднае свята, за якое яна выказвае шчырую падзяку старшыні Пінскага гарвыканкама В.У.Шусту, начальніку ўпраўлення эканомікі гарвыканкама М.М.Сяркову, дырэктару ЭМА «Палессе» С.Я.Дарафееву, старшыні Пінскага аддзялення БАЗІГП Т.А.Хвагінай, а таксама за фінансавую падтрымку — ТДА «Конпі», ЗАОСВП «АРД-Пінск», філіялу № 1 ААТ «Белтрыкатаж», ЧУПТП «АСВ», ААТ «Белінвестторг», індывідуальным прадпрымальнікам Барычэўскаму, Даніловічу.

Асаблівыя словы ўдзячнасці выканаўчаму дырэктару грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў» Вячаславу Юльянавічу Лукашыку і дырэктару друкарні «Юніпол» Аляксандру Аляксеевічу Купрыну.




Шчырая, сардэчная дапамога гэтых людзей і калектываў прынесла радасць у гасцінны дом Локунаў. Дарэчы, выхад кнігі — гэта асабістае свята не толькі Валянціны Іванаўны, але і яе матулі Евы Аляксандраўны, і брата Васіля Іванавіча, якія былі яе незаменнымі памочнікамі і дарадцамі.

Няхай больш святаў будзе ў нашых сэрцах, а значыць, і тых добрых людзей, якія іх дораць. Мо, тады пасвятлее на белым свеце...

**Ад рэдакцыі.** Як нам стала вядома, Нацыянальная бібліятэка Беларусі звярнулася да аўтара з просьбай набыць у свой фонд дзесятак экземпляраў яе кнігі. Трапіць яна і ў іншыя бібліятэкі краіны і, у першую чаргу, у цэнтральную пінскую.

**Марыя ЛЯШУК.**
**Фота Уладзіміра МЕЛЯШЭНКІ.**